**Карасёў А.**

# ГЕРОЙ — НАШ ЗЯМЛЯК

У мінулай вайне наша артылерыя не мела сабе роўных па агнявой магутнасці, арганізацыйнай структуры, баявому прымяненню. Ёю было знішчана 70 тысяч танкаў і штурмавых гармат, 167 тысяч мінамётаў і гармат, вялізная колькасць варожых салдат і афіцэраў. За гераізм, мужнасць і высокае майстэрства, праяўленыя ў баях, 1800 артылерыстаў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Сярод іх быў і гвардыі падпалкоўнік Кірыла Пракопавіч Чарноў, камандзір 29-й асобнай знішчальна-супрацьтанкавай артылерыйскай брыгады. Нарадзіўся Кірыла Пракопавіч у 1907 годзе ў вёсцы Амяленская Слабада Бабруйскага павета ў сялянскай сям'і. У 1930 годзе стаў камуністам. Закончыў аб'яднаную Беларускую ваенную школу імя ЦВК БССР, Вышэйшую афіцэрскую артылерыйскую школу, Вышэйшыя акадэмічныя артылерыйскія курсы. У Чырвонай Арміі служыў з 1929 года. З 1941-га ваяваў на Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, I і III Украінскіх франтах. Удзельнічаў у баях пад Сталінградам, на Курскай дузе, ля возера Балатон.

З першых дзён пасля прыбыцця ў брыгаду Кірыла Пракопавіч дзякуючы выдатным якасцям афіцэра заваяваў любоў і павагу ўсяго асабовага саставу. Пад яго кіраўніцтвам брыгада выконвала самыя адказныя даручэнні камандавання 47-й арміі.

22 верасня 1943 года брыгадзе была пастаўлена задача прыкрыць фланг арміі на фронце працягласцю 23 кіламетры і не дапусціць контрудару праціўніка ў фланг. Фашысты на працягу трох сутак сіламі да 40 танкаў з бронемашынамі і танкеткамі неаднаразова пераходзілі ў контратакі, імкнуліся прарваць абарону брыгады і выйсці з вёскі Чарнабой на шашу БагадуХаўка – Залатаношаўка, у тыл 47-й арміі. Артылерысты мужна і ўмела адбівалі атакі ворага, знішчылі 6 танкаў, 4 бронемашыны, 4 транспарцёры і 2 танкеткі. Падпалкоўнік К. П. Чарноў непасрэдна кіраваў боем. Дзякуючы ўмелай арганізацыі абароны брыгада з гонарам выканала пастаўленую задачу.

Затым ёй прадстаяла фарсіраваць Днепр і заняць супрацьтанкавую абарону на плацдарме. За Дняпром 2 кастрычніка праціўнік сіламі пяхотнай і танкавай дывізій і батальёна матацыклістаў пры падтрымцы артылерыі імкнуўся адкінуць нашы часці ад Дняпра. Пасля магутнай двухгадзіннай артылерыйскай падрыхтоўкі гітлераўцы пад прыкрыццём агню і дымавой завесы перайшлі ў атаку. Камандзір К. П. Чарноў умела кіраваў боем сваіх артылерыстаў. Палкі брыгады не адступілі, адбіўшы атаку 60 танкаў, знішчыўшы 29 гэтых машын і штурмавых гармат. Вораг адкаціўся назад. Але к вечару і з раніцы 3 кастрычніка праціўнік зноў атакаваў баявыя парадкі нашых войск. Асабовы састаў брыгады мужна адбіў усе атакі фашыстаў і

адкінуў іх на зыходныя пазіцыі. У гэтым баі на правым беразе Дняпра брыгада знішчыла 35 танкаў і да 2 тысяч салдат і афіцэраў праціўніка.

29-я гвардзейская знішчальна-супрацьтанкавая брыгада пад камандаваннем К. П. Чарнова з гонарам выканала пастаўленую задачу. За гэтыя подзвігі, за ўмелае кіраўніцтва палкамі ў складанай абстаноўцы К. П. Чарноў 24 снежня 1943 года быў удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза.

**Карасёў, А. Герой — наш зямляк / А. Карасёў // Трыбуна працы (Бабруйск). — 1987. — 19 лістапада. — С. 3.**